**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”**

**Філалагічны факультэт**

# ТЭСТЫ
# ПА ГІСТОРЫІ МОВАЗНАЎСТВА

## ПРАКТЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК
## ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

**Гомель 2003**

У аўтарскай рэдакцыі

**Аўтар-складальнік:**
**С.М.Аніськова,** кандыдат філалагічных навук

**Рэцэнзенты:**
**А.А.Станкевіч**, прафесар, доктар філалагічных навук
**Л. Ф.Кахоўская**, дацэнт, кандыдат філалагічных навук

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам Установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”26 лістапада 2003 года, пратакол №

Тэсты прызначаны для тэматычнага і выніковага кантролю ведаў, дапамогуць студэнтам-філолагам трывала замацаваць тэарэтычныя веды па курсу “Агульнае мовазнаўства” і асэнсавана выкарыстоўваць іх на практыцы.

©Аніськова С. М, 2003.
©Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны”, 2003

# ЗМЕСТ

Уводзіны........................................................................4

Тэст № 1........................................................................6
Тэст № 2........................................................................18
Тэст № 3........................................................................26
Тэст № 4........................................................................34
Тэст № 5........................................................................41
Тэст № 6........................................................................47
Тэст № 7........................................................................54
Тэст № 8........................................................................61

Літаратура........................................................................68
Адказы........................................................................70

## Уводзіны

Узрастанне патрабаванняў на дзяржаўным узроўні да якасці адукацыі будучых спецыялістаў, павышэнне ролі самастойнай работы студэнтаў у працэсе навучання вымагаюць ад выкладчыка на сучасным этапе няспыннага пошуку эфектыўных форм і метадаў арганізацыі працы, сярод якіх важнейшае месца займае тэсціраванне, паколькі, па-першае, гэта від аб'ектыўнага кантролю ведаў, які дазваляе пазбегнуць непатрэбных суб'ектыўных напластаванняў (сімпатыя – антыпатыя, залішняе хваляванне, няўпэўненасць у сабе, сарамлівасць, недавер да магчымасці справядлівай ацэнкі вуснага або звычайнага пісьмовага адказу і інш.), па-другое, для выканання тэставых заданняў не патрабуецца многа часу, што дазваляе, безумоўна, паглыбіць і пашырыць аб'ём інфармацыі, які студэнты атрымліваюць на занятках.

У вучэбны дапаможнік уключаны тэсты, якія ахопліваюць важнейшыя этапы гісторыі развіцця мовазнаўства, пачынаючы са старажытнаіндыйскага (V ст. да н.э.) і да сучаснага.

Па спосабе падачы матэрыялу тэсты з'яўляюцца тэматычнымі, ахопліваюць, як правіла, дзве – тры тэмы.Колькасць пытанняў па пэўных тэмах неаднолькавая, што абумоўлена як рознай ступенню распрацаванасці тых або іншых лінгвістычных праблем, так і месцам тэмы ў структуры курса. Паміж тэстамі захоўваецца пераемнасць, якая праяўляецца ў храналагічнай паслядоўнасці пры размяшчэнні тэм адпаведна ўзнікнення тых або іншых лінгвістычных напрамкаў, школ, канцэпцый. Пэўная частка матэрыялу кожнага наступнага тэста сфармулявана ў выглядзе параўнання з матэрыялам папярэдняга, што, безумоўна, спрыяе больш глыбокаму засваенню матэрыялу.

У тэсты ўключаюцца пытанні, а таксама заданні разнастайных тыпаў: а) вызначыць літарна-лічбавую адпаведнасць паміж некалькімі інфармацыйнымі блокамі; б)прадоўжыць выказванне, калі яго аўтар вядомы; в)параўнаць канцэпцыі тых або іншых моваведаў; г) акрэсліць храналагічныя межы існавання лінгвістычных школ, напрамкаў або этапаў развіцця мовазнаўства наогул; д) назваць аўтара той або іншай вядомай працы; ж) прааналізаваць пэўныя моўныя адзінкі ці з'явы з улікам неабходных паказчыкаў.

Правільны адказ на пытанні тэсту можа быць заключаны ў адным з варыянтаў адказу, а можа з’яўляцца фактычна аб’яднаннем некалькіх узаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых палажэнняў. Такі падыход, на нашу думку, з’яўляецца апраўданым, паколькі студэнт не проста выбірае пэўны тэзіс, а вучыцца сістэмнаму аналізу моўных з’яў, што праяўляецца не столькі ў тым, каб знайсці правільны адказ, колькі ў тым, каб заўважыць, што гэты адказ ёсць сінтэз некалькіх правільных тэзісаў адначасова.

Тэсты прызначаны для індывідуальнай або франтальнай праверкі ведаў па гісторыі мовазнаўства студэнтаў-філолагаў дзённай і завочнай форм навучання , могуць быць таксама карыснымі пры падрыхтоўцы да экзамену па курсе “Агульнае мовазнаўства”.

## Тэст № 1

1. Назавіце прадмет вывучэння курса “Агульнае мовазнаўства”.

А. Адна мова;
Б. Некалькі роднасных моў;
В. Пэўная моўная сям’я;
Г. Моўны саюз;
Д. Моўны інварыянт.

2. З якіх раздзелаў складаецца курс “Агульнае мовазнаўства”?

А. Метады і прыёмы лінгвістычнага даследавання
Б. Пунктуацыя;
В. Тэорыя мовы;
Г. Гісторыя мовазнаўства;
Д. Стылістыка.

3. Укажыце, якія з пералічаных ніжэй рыс характарызуюць моўны інварыянт.

А. Камунікатыўная функцыя мовы;
Б. Наяўнасць у мове зацвярдзелых гукаў: [ж] [ш], [ч], [ž], [р],[ц];
В. Членападзельнасць (дыскрэтнасць) мовы ;
Г. Функцыянаванне мовы ў вуснай і пісьмовай формах;
Д. Прыстаўныя галосныя і зычныя: [і],[а],[в],[г];
Ж. Функцыянальна-стылявое чляненне літаратурнай мовы;
З. Сістэмна-структурная арганізацыя мовы;
К. Дзеканне, цеканне;
Л. Падаўжэнне зычных;
М. Мова – важнейшы інструмент пазнання акаляючай рэчаіснасці і перадачы жыццёвага вопыту з пакалення ў пакаленне.

4. У чым адрозненне паміж прыватным мовазнаўствам і агульным?

А. Прадмет даследавання;
Б. Метады даследавання;
В. І прадмет, і метады даследавання.

5. Што вывучае ўнутраная лінгвістыка?

А. Сувязі мовы з іншымі дысцыплінамі;
Б. Будова, стан мовы.

6. Назавіце навукі, якія ўзніклі на сумежжы даных навук (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. Лінгвістыка і сацыялогія;
Б. Лінгвістыка і геаграфія;
В. Лінгвістыка і семіётыка;
Г. Лінгвістыка і гнасеалогія (тэорыя пазнання);
Д. Лінгвістыка і псіхалогія;
Ж. Лінгвістыка і матэматыка;
З. Лінгвістыка і кібернетыка;
К. Лінгвістыка і гісторыя.

I. Матэматычная лінгвістыка;
II. Псіхалінгвістыка;
III. Кібернетычная лінгвістыка;
IV. Сацыялінгвістыка;
V. Гістарычная лінгвістыка;
VI. Менталінгвістыка;
VII. Лінгвасеміётыка;
VIII. Лінгвагеаграфія.

7. Укажыце, у межах якой дысцыпліны аб’ядноўваецца мовазнаўства і літаратуразнаўства.

А. Герменеўтыка;
Б. Філалогія;
В. Псіхалінгвістыка;

8. Як называецца навука, якая вывучае працэсы спараджэння і ўспрымання маўленчай дзейнасці чалавека?

А. Этымалогія;
Б. Тэорыя мастацкага перакладу;
В. Псіхалінгвістыка.

9. Чым абумоўлены падзел мовазнаўства на сінхранічнае і дыяхранічнае?

А. Стан мовы (або адзін храналагічны зрэз, або вывучэнне мовы ў працэсе яе развіцця);
Б. Статыка і дынаміка моўных з’яў;
В. Універсальнасць або нацыянальная спецыфіка пэўных моўных з’яў.

10. Назавіце асноўныя задачы, якія вырашае прыкладная лінгвістыка.

А. Аўтаматычная апрацоўка інфармацыі;
Б. Даследаванне сістэмна-структурнай арганізацыі мовы;
В. Стварэнне штучнага інтэлекту;
Г. Камунікацыя ў сістэме чалавек – камп’ютэр – чалавек;
Д. Вывучэнне антыномій мовы;
Ж. Вызначэнне лінгвістычных універсалій;
З. Распрацоўка пытанняў тыпалогіі моў;
К. Даследаванне граматычнай формы слоў і спосабаў яе рэпрэзентацыі.

11. Чым адрозніваецца супастаўляльнае мовазнаўства ад тыпалагічнага?

А. У супастаўляльным мовазнаўстве даследуюцца дзве або некалькі роднасных моў, у тыпалагічным – мноства моў, якія знаходзяцца паміж сабой у рознай ступені роднасці, або наогул не з’яўляюцца роднаснымі;
Б. У тыпалагічным мовазнаўстве вывучаюцца роднасныя мовы, у супастаўляльным – як роднасныя, так і няроднасныя мовы.

12. Якія межы храналагічна ахоплівае першы этап у гісторыі агульнага мовазнаўства?

А. V ст. да н.э. – XIV ст.;
Б. III ст. да н.э. – XVI ст.;
В. V ст. да н.э. – XVIII ст.

13. Мовазнаўства якой краіны лічыцца найбольш старажытным?

А. Кітай;
Б. Індыя;
В. Егіпет;
Г. Турцыя.

14. Што такое санскрыт?

А. Літаратурна-пісьмовая мова старажытнай Індыі;
Б. Старажытнакітайская мова;
В. Старажытнаарабская мова.

15. Як называліся самыя старажытныя помнікі індыйскай літаратуры?

А. “Веды” (“Ведангі”);
Б. “Граматыкі”;
В. “Песні”.

16. Хто з’яўляецца аўтарам першай нарматыўнай граматыкі індыйскай мовы?

А. Прысцыян;
Б. Халіл-аль-Фарахідзі;
В. Паніні.

17. Хто з індыйскіх моваведаў упершыню ў мовазнаўстве выказаў ідэю гістарычнага развіцця моў і ўпершыню прымяніў параўнальна-гістарычны метад?

А. Саганы;
Б. Данат
В. Вараручы Кацьяяна.

18. Хто першым у гісторыі індыйскага мовазнаўства выкарыстаў параўнальны метад, параўноўваючы санскрыт і мову ”Ведаў”?

А. Бхартхары;
Б. Паніні;
В. Вараручы Кацьяяна.

19. Лінгвістычную канцэпцыю якога старажытнаіндыйскага моваведа характарызуюць наступныя палажэнні:

– адрозненне ў слове трох аспектаў :пісьмовай формы, фаналагічнай структуры, намінатыўнай функцыі;

– вывучэнне суадносін паміж сказам і суджэннем у філасофскім аспекце;

– сказ – асноўная адзінка мовы, таму што толькі ён перадае думку;

– словы служаць для апісання моўнага матэрыялу, але самі ў гэты матэрыял не ўваходзяць;

– неабходнасць звароту да папярэдніх лінгвістычных традыцый пры вывучэнні моўных з’яў.

А. Паніні;
Б. Вараручы Кацьяяна;
В. Бхартхары.

20. Назавіце аўтара першага слоўніка санскрыту.

А. Саганы;
Б. Амара;
В. Бхартхары.

21. Запоўніце табліцу па наступнаму ўзору:

Асноўныя дасягненні
старажытнаіндыйскага мовазнаўства

| Раздзел мовазнаўства | Асноўныя дасягненні |
|---|---|
| Фанетыка | 1. Размежаванне гука і фанемы.<br>2. Класіфікацыя гукаў па спосабе і месцы ўтварэння.<br>3. Падзел гукаў на галосныя і зычныя.<br>4. Выдзяленне трох ступеней пад'ёму галосных.<br>5. Вызначэнне ролі чаргаванняў гукаў. |
| Марфалогія | |
| Словаўтварэнне | |
| Сінтаксіс | |
| Лексікаграфія | |

22. Лінгвістычную традыцыю якой старажытнай краіны можна ахарактарызаваць наступнымі рысамі:

– складовы, а не гукавы характар мовы;

–мова адносіцца да ізаляванага тыпу, а не флектыўнага;

–ідыяграфічная пісьменнасць;

–выдзяленне ў структуры склада двух элементаў: ініцыялі (шэн – пачатковы зычны) і фіналі (юнь – канцоўка склада, ці рыфма, якая ўключае таніраваны складаўтваральны галосны).

А. Грэцыя;
Б. Егіпет;
В. Індыя;
Г. Кітай.

23. Укажыце прызначэнне кожнага з названых слоўнікаў у старажытнакітайскім мовазнаўстве. (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. “Эр’я” (слоўнік не мае аўтара);
Б. “Фан’янь” (Ян Сюн);
В. “Шо вэнь” (Сюй Шэнь);
Г. “Цэ юнь” (Лу Фаянь).

I. Сістэматызацыя рыфмаў у структуры сказа;
II. Тлумачэнне значэнняў іерогліфаў, іх структуры і паходжання;
III. Тлумачэнне слоў са старажытных помнікаў пісьменнасці;
IV. Тлумачэнне дыялектных слоў.

24. Якія перыяды вылучаюцца ў гісторыі старажытна-грэчаскага мовазнаўства? Акрэсліце іх храналагічныя межы.

А. Філасофскі перыяд;
Б. Неаграматычны перыяд;
В. Александрыйскі перыяд;
Г. Параўнальна-гістарычны перыяд.

25. Каму са старажытных філосафаў належыць вядомы выраз “Толькі чалавек з усіх жывых істот адораны маўленнем”?

А. Піфагор;
Б. Эпікур;
В. Арыстоцель;
Г. Дыяген.

26. Якую важнейшую (для лінгвістаў) думку выказаў Ціт Лукрэцый Кар у паэме “Аб прыродзе рэчаў”?

А. Мова не можа быць боскай па паходжанні і створанай па волі аднаго чалавека;
Б. Слова з’яўляецца ўмоўнай назвай прадмета;
В. Мова мае боскае паходжанне.

27. Хто са старажытных грэчаскіх гісторыкаў звязваў праблему ўзнікнення мовы з праблемай аб паходжанні чалавека?

А. Плутарх;
Б. Дыядор Сіцылійскі;
В. Дыяген;
Г. Дыскол.

28. Назавіце асноўныя працы Арыстоцеля.

А. “Паэтыка”;
Б. “Граматыка”;
В. “Рыторыка”;
Г. “Камус”.

29. Якую пазіцыю займаў кожны з названых філосафаў у дыскусіі аб прыродзе найменн? (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока.)

А. Геракліт;
Б. Арыстоцель;
В. Дэмакрыт;
Г. Платон;

I. Спачатку словы называюць прадметы на падставе прыроднай з імі сувязі, якая затым пастуова губляецца, пераўтвараючы слова ва ўмоўную назву
II. Словы з самага пачатку з’яўляюцца ўмоўнымі найменнямі прадметаў;
III. Назва прадмета вызначаецца самой прыродай гэтага прадмета.

30. Якія аргументы, на думку Дэмакрыта, сведчаць аб умоўным характары найменн?

А. Некаторыя словы маюць па некалькі значэнняў;
Б. Пэўнае паняцце можа мець некалькі назваў;
В. Адно слова можа замяняцца другім;
Г. Некаторыя паняцці застаюцца без слоўнага абазначэння;

31. Ці адрозніваецца змест паняцця “склон” у Арыстоцеля і ў сучаснай лінгвістыцы?

А. Адрозніваецца;
Б. Не адрозніваецца.

32. Каму ў старажытнагрэчаскім мовазнаўстве належыць лінгвістычная канцэпцыя, якая ўключае наступныя палажэнні:

–падзел гукаў на галосныя, паўгалосныя, безгалосныя на аснове фізіялагічнага прынцыпу;
–выдзяленне трох часцін мовы: імені, дзеяслова, злучніка;
–імя і дзеяслоў – асноўныя часціны мовы;
–катэгорыя склону аб’ядноўвае як ускосныя формы імёнаў, так і дзеясловаў;
–увядзенне паняцця “элемент”, набліжанага да паняцця “фанема”;
–вызначэнне складу як спалучэння галоснага і зычнага гукаў.

А. Зянон;
Б. Платон;
В. Арыстоцель.

33. З прыведзеных ніжэй палажэнняў укажыце тыя, якія характарызуюць лінгвістычную дзейнасць стоікаў.

А. Распрацоўка праблем акцэнталогіі;
Б. Выдзяленне пяці часцін мовы: імя ўласнае, імя агульнае, дзеяслоў, злучнік, член;
В. Адрозненне паміж сказам і словам заключаецца ў тым, што сказ – заўсёды значымы, слова ж можа быць як значымым, так і нязначымым;
Г. Узнікненне этымалогіі;
Д. Вырашэнне пытанняў словаўтварэння.

34. Назавіце прадстаўнікоў Александрыйскай граматычнай школы.

А. Кратэс Малоскі;
Б. Арыстарх Самафракійскі;
В. Платон;
Г. Дыянісій Фракійскі;
Д. Хрысіп;
Ж. Апалоній Дыскол;
З. Арыстоцель.

35. Хто са старажытнагрэчаскіх моваведаў увёў у навуковы ўжытак паняцце “націск” і ўказаў на розныя тыпы націску?

А. Арыстарх Самафракійскі;
Б. Апалоній Дыскол;
В. Дыянісій Фракійскі.

36. Хто першым у мовазнаўстве парапанаваў надрадковыя значкі для абазначэння націску?

А. Дыянісій Фракійскі;
Б. Арыстафан Візантыйскі;
В. Апалоній Дыскол.

37. Запоўніце наступную табліцу па ўзору.

Асноўныя дасягненні
Александрыйскай граматычнай школы

| Раздзел мовазнаўства | Асноўныя дасягненні |
|---|---|
| Акцэнталогія | 1. Увядзенне паняцця “націск” і вызначэнне яго тыпаў.<br>2. Выкарыстанне надрадковых значкоў для абазначэння націску. |
| Фанетыка | |
| Марфалогія | |
| Сінтаксіс | |

38. Назавіце недахопы старажытнагрэчаскага мовазнаўства.

А. Незалежнасць мовазнаўства ад філасофіі;
Б. Блытаніна паміж лагічнымі катэгорыямі і моўнымі адзінкамі;
В. Адсутнасць падзелу гукаў на зычныя і галосныя;
Г. Адсутнасць гістарычнага падыходу да мовы;
Д. Не было дакладнага размежавання паміж літарай і гукам
Ж. Залежнасць мовазнаўства ад філасофіі;
З. Адсутнасць вучэння аб граматычных катэгорыях розных часцін мовы;
К. Па-за межамі даследавання – іншыя мовы.

39. Якія працы належаць названым рымскім граматыстам? (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока.)

А. Марк Цярэнцій Варон;
Б. Элій Данат;
В. Прысцыян.

I. “Граматычны дапаможнік”;
II. “Лацінская мова”;
III. “Курс граматыкі”.

40. Хто з’яўляецца заснавальнікам арабскага мовазнаўства і ўкладальнікам першага арабскага слоўніка “Кніга Айна”?

А. Саганы;
Б. Хрысіп;
В. Дыскол;
Г. Халіл-аль-Фарахідзі.

41. Каму належыць аўтарства 60-томнага слоўніка “Камус”, назва якога стала выкарыстоўвацца для любога слоўніка вялікага аб’ёму наогул?

А. Халіл-аль-Фарахідзі;
Б. Саганы;
В. аль-Фірузабадзі.

42. Запоўніце табліцу.

Асноўныя дасягнення
старажытнага арабскага мовазнаўства

| Раздзел мовазнаўства | Асноўныя дасягненні |
|---|---|
| Фанетыка | 1. Дакладнае размежаванне літары і гука;<br>2. Класіфікацыя гукаў на падставе фізіялагічнага і акустычнага прынцыпаў. |
| Граматыка | |
| Лексікаграфія | |

## Тэст № 2

1.Хто з’яўляецца аўтарам трактата “Аб народным маўленні”?

А. Ціт Лукрэцый Кар;
Б. Плутарх;
В. Гесіод;
Г. Дантэ Аліг’еры.

2. На якой мове напісаны трактат “Аб народным маўленні”?

А. Лацінская мова;
Б.Французская мова;
В. Грэчаская мова;
Г. Італьянская мова.

3.Якія храналагічныя межы ахоплівае перыяд Сярэднявечча?

А. XVI–XVIII стагоддзі;
Б. V–XV стагоддзі;
В.XIV–XVI стагоддзі;
Г. V–X стагоддзі.

4.На якой мове напісана “Песня пра зубра” Міколам Гусоўскім?

А. Беларуская мова;
Б. Руская мова;
В. Польская мова;
Г. Лацінская мова.

5.У чым, на думку Дантэ, праяўляецца двухбаковая прырода мовы?

А. Лексічнае і граматычнае значэнне моўных адзінак;
Б. Пачуццёвы і змястоўны аспекты, г. зн. гучанне і значэнне;
В. Графічная і акустычная сістэмы мовы.

6. Укажыце пункт гледжання наміналістаў і рэалістаў у сярэдневяковай дыскусіі аб прыродзе наймення.

А. Рэалісты (Ансельм Кентэрберыйскі);
Б. Наміналісты (Расцэлін, Абеляр);

I. Паняцці існуюць самастойна, рэальна, незалежна ад прадметаў і папярэднічаюць ім;
II. Рэальна існуюць толькі рэчы, а паняцці і імёны з’яўляюцца вытворнымі ад іх;
III. Паняцці–частка саміх рэчаў, іх неад’емная ўласцівасць.

7. Раскрыйце.сутнасць наступных паняццяў:

А. Рэнесанс;
Б. Рэфармацыя;
В. Асветніцтва.

I. Крызіс папскай улады і актывізацыя дэмакратычных сіл у грамадстве;
II. Пашырэнне асветы ў жыцці грамадства;
III. Культурнае адраджэнне.

8. Хто першым у Расіі (XVI ст.) пачынае распрацоўку граматычных пытанняў?

А. М Сматрыцкі;
Б. Ф. Максімаў;
В. Максім Грэк;
Г. М. Ламаносаў.

9. Па трапнай заўвазе Ф. І. Буслаева, гісторыя айчыннага мовазнаўства пачынае свой адлік ад ...(прадоўжыце думку)

А. Лінгвістычнай дзейнасці П. Бярынды;
Б. Граматык Л. Зізанія і М. Сматрыцкага;
В. “Расійскай граматыкі” М. В. Ламаносава.

10. Хто з’яўляецца аўтарам першай уласна славянскай граматыкі, якая выйшла ў свет у 1596 годзе?

А. П Бярында;
Б. Л. Зізаній;
В. М. Ламаносаў;
Г. М. Сматрыцкі.

11. Пытанні якіх раздзелаў мовазнаўства разглядаюцца ў Граматыцы Л. Зізанія?

А. Сінтаксіс, лексікалогія;
Б. Арфаграфія, прасодыя;
В. Фразеалогія, словаўтварэнне;
Г. Этымалогія, марфалогія.

12. Каму належыць першы вопыт групоўкі еўрапейскіх моў (выдзяленне чатырох вялікіх моўных груп: лацінскай, грэчаскай, тэўтонскай,славянскай)?

А. Рамус;
Б. Ж. Скалігер;
В. Я. Грым;
Г. Максім Грэк.

13. Слоўнікі якіх тыпаў упершыню ўзніклі ў мовазнаўстве XVII–XVIII стагоддзяў?

А. Этымалагічны слоўнік;
Б. Шматмоўны слоўнік-каталог;
В. Фразеалагічны слоўнік;
Г. Дыялектны слоўнік.

14. Які моўны матэрыял быў выкарыстаны І. Адэлунгам і І. Фатэрам у слоўніку “Мітрыдат, або агульнае мовазнаўства”?

А. Народныя песні;
Б. Казкі;
В. Малітва “Ойча наш”;

Г. Легенды.

15. На роднасць якіх моў указаў М. Ламаносаў на падставе праведзенага ім этымалагічнага аналізу лічэбнікаў ад аднаго да дзесяці?

А. Руская, грэчаская, лацінская, нямецкая мовы;
Б. Літоўская, латышская, пруская мовы,
В. Італьянская,англа-саксонская, галандская мовы.

16. Назавіце аўтараў і год выдання "Універсальнай і рацыянальнай граматыкі".

А. 1806 г., І. Адэлунг, І. Фатэр;
Б. 1676 г., Ферары, П. Палас;
В. 1800 г., Л. Эрвас-і-Пандуро, Менаж;
Г. 1660 г., А. Арно, К. Лансло;

17. Вызначце адпаведнасць моўных адзінак і лагічных катэгорый.

А. Слова;
Б. Сказ.

І. Прэдыкат;
ІІ. Суджэнне;
ІІІ. Аб'ект;
IV. Паняцце.

18. Назавіце элементы лагічнай структуры сказа (па "Універсальнай і рацыянальнай граматыцы").

А. Суб'ект;
Б. Класіфікатар дзеяння;
В. Аб'ект;
Г. Звязка;
Д. Атрыбут.

19. Укажыце класы слоў, якія, на думку А. Арно і К. Лансло, выкарыстоўваюцца як спосаб, манера развіцця думкі.

А. Назоўнік, займеннік;
Б. Артыкль, дзеепрыметнік;
В. Прыназоўнік, прыслоўе;
Г. Дзеяслоў, злучнік, выклічнік.

20. Вызначце сутнасць двухбаковай прыроды моўных знакаў у адпаведнасці з “Універсальнай і рацыянальнай граматыкай”.

А. Знешні аспект;
Б. Унутраны аспект.

I. Спосаб, якім чалавек выражае свае думкі;
II. Статыка і дынаміка моўных з’яў;
III. Сінхранічны і дыяхранічны падыходы да мовы;
IV. Гукавая і графічная сістэма.

21. Які сэнс укладвалі ў разуменне паняцця “граматыка” А. Арно і К. Лансло?

А. Сістэма граматычных правілаў;
Б. Мастацтва маўлення;
В. Марфалогія і сінтаксіс;
Г. Сістэма граматычных катэгорый.

22. Заснавальнікам якіх тэорый паходжання мовы лічыцца Ж.-Ж. Русо (1712-1778)?

А. Тэорыя геннай мутацыі;
Б. Тэорыя сацыяльнай дамоўленасці;
В. Тэорыя semiятычнага скачка;
Г. Тэорыя страты тэлепатычнай здольнасці;
Д. Тэорыя эмацыянальных выклічнікаў.

23. Хто з французскіх матэрыялістаў указваў на камунікатыўную функцыю мовы як галоўнаю, але лічыў, што мова мае боскае паходжанне?

А. Вальтэр;
Б. Ж.-Ж. Русо;
В. Дзідро;
Г. Монтэск’ё.

24. Якую тэорыю паходжання мовы распрацаваў Г. Лейбніц (1646-1716)?

А. Тэорыя эмацыянальных выклічнікаў;
Б. Тэорыя працоўных рытмічных выгукаў;
В. Гукапераймальная тэорыя;
Г. Тэорыя семіятычнага скачка.

25. Хто ў гісторыі мовазнаўства з’яўляецца стваральнікам першай тэорыі натуральнага паходжання мовы, сутнасць якой заключаецца ў тым, што паходжанне і гісторыя мовы непарыўна звязаны з гісторыяй мыслення?

А. І. Гердэр;
Б. Д. Дзідро;
В. Вальтэр;
Г. Ж.-Ж. Русо.

26. Хто ўпершыню ў гісторыі мовазнаўства выказаў ідэю аб стварэнні штучнай мовы?

А. Г. Лейбніц;
Б. Р. Дэкарт;
В. Ф. Бэкан;
Г. Д. Лок.

27. Хто з філосафаў-матэрыялістаў прапанаваў тэорыю стварэння мадэлей штучных фармалізаваных моў шляхам выкарыстання матэматычнай сімволікі?

А. Д. Дідро;
Б. Ж.-Ж. Русо;
В. Г. Лейбніц.

28. Хто першым указаў на падабенства лацінскай мовы і санскрыту і верагоднасць іх паходжання ад агульнай прамовы, якой больш не існуе?

А. Керду;
Б. У. Джонс;
В. Ф. Рухінг;
Г. М. Літуанус.

29. Якая функцыя мовы ў грамадстве з’яўляецца важнейшай, на думку М. В. Ламаносава?

А. Функцыя зносін (камунікатыўная);
Б. Функцыя выражэння пачуццяў (эмацыйная);
В. Функцыя паведамлення (інфармацыйная).

30. Якія дыялекты, паводле лінгвістычнай канцэпцыі М.В. Ламанасава, ляглі ў аснову рускай мовы?

А. Паўднёва-заходні дыялект;
Б. Украінскі дыялект;
В. Маскоўскі дыялект;
Г. Паморскі дыялект;
Д. Паўночна-ўсходні дыялект.

31. Падзяліце наступныя часціны мовы на галоўныя і дапаможныя, паводле “Расійскай граматыкі” М.В.Ламаносава (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. Галоўныя часціны мовы;
Б. Дапаможныя часціны мовы;

I. Займеннік;
II. Назоўнік;
III. Злучнік;
IV. Дзеепрыметнік;
V. Прыслоўе;

VI. Прыназоўнік;
VII. Дзеяслоў;
VIII. Выклічнік.

32. Які прынцып павінен быць пакладзены ў аснову рускай арфаграфіі, на думку М.В.Ламаносава.?

А. Фанетычны прынцып;
Б. Марфалагічны прынцып.

33. Укажыце асноўныя характарыстыкі сказа (у адпаведнасці з лінгвістычнай канцэпцыяй М.В.Ламаносава).

А. Асноўныя часткі сказа – даданыя члены;
Б. Сказ суадносіцца з паняццем;
В. Сказ суадносіцца з суджэннем;
Г. Сказ выражае закончаную думку;
Д. Сказ характарызуецца граматычна афармленай сувяззю слоў, якія ўваходзяць у яго склад.

## Тэст №3

1. Калі ўзнікла параўнальна-гістарычнае мовазнаўства?

А. XVII стагоддзе;
Б. XVIII стагоддзе;
В. Пачатак XIX стагоддзя.

2. Што паслужыла штуршком для ўзнікнення і развіцця кампаратывістыкі?

А. Адкрыццё еўрапейцамі санскрыту;
Б. Стварэнне "Універсальнай і рацыянальнай граматыкі";
В. Распрацоўка тэорыі штучнай (фармалізаванай) мовы.

3. Назавіце асноўныя задачы, вырашэннем якіх займаецца параўнальна-гістарычнае мовазнаўства.

А. Даследаванне сувязей мовы і мыслення;
Б. Праблема паходжання моў (монагенетычная і полігенетычная тэорыі), роднасных сувязей і адносін паміж мовамі;
В. Вывучэнне знакавай тэорыі мовы;
Г. Распрацоўка методыкі рэканструкцыі праформ;
Д.Устанаўленне крытэрыяў роднасці моў;
Ж. Вывучэнне фактараў моўнага развіцця.

4. Укажыце асноўныя рысы, якія характарызуюць роднасныя мовы.

А. Двухбаковасць моўнага знака;
Б. Тэрытарыяльнае суседства;
В. Паходжанне ад агульнага продка;
Г. Падабенства ў значэнні каранёў і афіксаў;
Д. Фанетычная і граматычная адпаведнасці паміж мовамі.

5. Ці могуць лексічныя адпаведнасці паміж мовамі (наяўнасць лексем з аднолькавым значэннем) служыць надзейнымі крытэрыямі роднасці гэтых моў?

А. Могуць, таму што роднасныя мовы заўсёды маюць тоесныя лексемы;

Б.Не могуць, таму што лексічныя адпаведнасці паміж мовамі часта з'яўляюцца вынікам запазычвання ў працэсе разнастайных кантактаў.

6. Назавіце прадстаўнікоў параўнальна-гістарычнага мовазнаўства ў Расіі.

А. В.У. Вінаградаў;
Б. А.Х. Вастокаў;
В. Ф.І. Буслаеў;
Г. І.І. Сразнеўскі.

7. Хто з'яўляецца аўтарам слоўніка "Матэрыялы для слоўніка старажытнарускай мовы па пісьмовых помніках"?

А. І.І. Мешчанінаў;
Б. П.П. Фартунатаў;
В. А.А. Шахматаў;
Г. І.І. Сразнеўскі.

8. Хто першым з кампаратывістаў правёў класіфікацыю славянскіх моў і аб'яднаў іх у тры групы – паўночную, паўднёвую, усходнюю?

А. Ф. Шлегель;
Б. Ф.П. Адэлунг;
В. А.А. Вастокаў;
Г. І. Арнатоўскі.

9, Хто з даследчыкаў рускай мовы выдзяляў у гісторыі яе развіцця тры этапы: старажытны (IX-XIV ст.ст.), сярэдні (XV-XVI ст.ст.), новы (з XVII ст.)?

А. А.А. Шахматаў;
Б. А.Х. Вастокаў;
В. Ф.І. Буслаеў;
Г. В.У. Вінаградаў.

10. Назавіце прадстаўнікоў параўнальна-гістарычнага мовазнаўства ў Заходняй Еўропе.

А. Ф. Боп;
Б. Р.Б. Якабсон;
В. Я. Грым;
Г. Р. Раск;
Д. Л. Ельмслеў.

11. Хто з'яўляецца заснавальнікам гістарычнай граматыкі нямецкай мовы?

А. Я. Грым;
Б. Ф. Шлегель;
В. А. Шлейхер;
Г. В. Гумбальт.

12. Хто з даследчыкай мовы ўвёў у навуковы ўжытак тэрмін "індаеўрапейскія мовы"?

А. Я. Грым;
Б. Р. Раск;
В. Ф. Боп;
Г. А. Шлейхер.

13. Назавіце асноўныя дасягненні Я. Грыма ў распрацоўцы пытанняў кампаратывістыкі і агульнага мовазнаўства.

А. Стварэнне схемы генеалагічнага дрэва індаеўрапейскіх моў;
Б. Апісанне гістарычнай фанетыкі германскіх моў, першага і другога перамяшчэння зычных у гэтых мовах;
В. Тэорыя рэканструкцыі праформ;
Г. Мова – вечна зменлівая катэгорыя, у якой дзейнічаюць супрацьлеглыя сілы;
Д. Мова ў сваім развіцці праходзіць тры ступені: а) рост каранёў; б) з'яўленне суфіксаў і флексій; в) гарманізацыя цэлага;

Ж. Мова ўзнікла натуральным шляхам і падобна да жывога арганізму: яна нараджаецца, развіваецца, адмірае.

14. Якія з прыведзенных палажэнняў ілюструюць асноўны ўклад Ф. Бопа ў вырашэнне праблем параўнальна-гістарычнага мовазнаўства?

А Распрацоўка тэорыі аглютынацыі;
Б. Правяденне тыпалагічнай класіфікацыі моў;
В. Доказ існавання індаеўрапейскай моўнай сям'і;
Г. Стварэнне параўнальна-гістарычнай граматыкі індаеўрапейскіх моў;
Д. Распрацоўка тэорыі рэканструкцыі праформ.

15. Хто з'яўляецца заснавальнікам скандынаўскай філалогіі?

А. Я. Брэдсдорф;
Б. Э. Сепір;
В. Р. Раск;
Г. Б. Уорф.

16. Назавіце асноўныя палажэнні лінгвістычнай канцэпцыі Р. Раска.

А. Распрацоўка тэорыі аглютынацыі;
Б. Асновай доказу роднасці моў з'яўляюцца граматычныя адпаведнасці;
В. Адкрыццё закону першага перамяшчэння зычных у германскіх мовах;
Г. Лексічныя адпаведнасці паміж мовамі могуць быць вынікам запазычвання і не сведчыць аб роднасці гэтых моў;
Д. Генеалагічная класіфікацыя моў.

17. Чыё імя носіць Берлінскі універсітэт?

А. Братоў Вільгельма і Аляксандра Гумбальтаў;
Б. А. Шлейхера;

В. Ф. Шлегеля.

18. Якая праца В. Гумбальта з’яўляецца вяршыняй яго філасофіі мовы?

А. “Аб прыродзе граматычных форм наогул і аб духу кітайскай мовы ў прыватнасці”(1827);

Б. “Аб мове каві на востраве Ява”(1836–1839);

В. Аб паходжанні граматычных форм і аб іх уплыве на развіццё ідэй”(1822).

19. В. Гумбальт пісаў: “Народы больш адораныя і тыя, што знаходзяцца ў больш спрыяльных умовах, чым іншыя, маюць і больш дасканалыя мовы.” Ці правільнае, з п. гл. сучаснага мовазнаўства, гэта меркаванне?Адказ аргументуйце.

А. Так. Узровень цывілізацыі вызначае ўзровень развіцця моў.

Б. Не. Няма народаў больш і менш адораных, як і моў дасканалых і недасканалых.

20. Якім чынам В. Гумбальт тлумачыў паходжанне мовы?

А. Матэрыялістычны падыход: мова – сацыяльны прадукт;

Б. Ідэалістычны падыход: мова не прадукт нічыёй дзейнасці, не стварэнне народаў, а дар, які выпаў ім на долю.

21. Якія функцыі мовы раскрывае наступны тэзіс В. Гумбальта: “мова функцыянуе для абазначэння прадметаў і як сродак зносін”?

А. Апеляцыйная функцыя;

Б. Намінатыўная функцыя;

В. Камунікатыўная функцыя;

Г. Інфармацыйная функцыя.

22. Якія фактары, на думку В. Гумбальта, абумоўліваюць адрозненні паміж мовамі?

А. Міграцыі народаў;
Б. Духоўная своеасаблівасць нацый;
В.Наяўнасць/ адсутнасць нацыянальных літаратур.

23. Які змест укладваў В. Гумбальт у разуменне паняцця"форма мовы"?

А. Форма мовы наогул – тое, што і граматычная форма;
Б. Форма мовы – гэта сукупнасць моўных адзінак;
В. Форма мовы –гэта спосаб злучэння думкі з гукамі.

24. Назавіце ўмовы цэласнасці мовы, па Гумбальту.

А. Выразнасць і пэўнасць выражэння думак плюс адпаведнае багацце слоў;
Б. Наяўнасць моўных адзінак і правілаў іх выкарыстання;
В. Багацце і строгая спарадкаванасць форм для выражэння граматычных адносін.

25. У якіх умовах, на думку В. Гумбальта, слова набывае свой поўны сэнс?

А. Пры суадносінах з паняццем, для абазначэння якога гэта слова выкарыстоўваецца;
Б. Пры рэалізацыі ў кантэксце;
В. Пры вызначэнні дакладнага месца слова як моўнай адзінкі ў іерархіі моўных адзінак іншых узроўняў.

26. Ці можна пагадзіцца з тэзісам В. Гумбальта, што мова як зменлівая з'ява мае "нейкую мяжу сваёй завершанасці,пасля дасягнення якой ужо не падпадае ніякім зменам"?

А. Так. Любая мова мае такую мяжу;
Б. Не. Мова, якая функцыянуе як сродак зносін, не можа мець такой мяжы, таму што пастаянна змяняецца пад

уплывам экстралінгвістычных і інтралінгвістычных фактараў, аднак пры гэтым захоўвае адносна ўстойлівы характар, што робіць магчымым яе пераемнасць з пакалення ў пакаленне.

В. Так, але толькі ў дачыненні да мёртвых моў, якія не маюць сферы фукцыянавання і таму, зразумела, не могуць развівацца.

27. Чым, на думку В. Гумбальта, абумоўлены змены ў мове?

А. Моўныя змены – вынік пастаяннага працэсу ўтварэння новых слоў і словаформ;

Б. Моўныя змены – вынік пераходу моў з вуснага ў пісьмовы стан;

В. Моўныя змены – вынік дзеяння дыялектычных унутрымоўных супрацьлегласцей.

28. Якія крытэрыі В. Гумбальт лічыў асноўнымі пры падзеле моў на “дасканалыя” і “недасканалыя”?

А. Наяўнасць полісеміі і сінаніміі;

Б. Форма мовы як спосаб злучэння думкі і гука;

В. Узровень цывілізаванасці народа-носьбіта мовы.

29. З улікам якіх паказчыкаў В. Гумбальтам была праведзена тыпалагічная класіфікацыя моў?

А. Структура слова і сказа;

Б Спосаб выражэння граматычных адносін;

В. Колькасць граматычных катэгорый;

Г. Наяўнасць / адсутнасць полісеміі.

30. Размяжуйце наступныя мовы па пэўных тыпах (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. Семіцкія мовы;

Б. Цюркскія мовы;

В. Кітайская мова;

Г. Індаеўрапейскія мовы;
Д. Палеазіяцкія мовы;
Ж. Мовы амерыканскіх індзейцаў.

I.  Флексійныя мовы;
II.  Ізаляваныя (аморфныя) мовы;
III. Аглютынацыйныя;
IV. Інкарпарыруючыя мовы.

## Тэст № 4

1. Хто першым з антычных мысліцеляў вызначыў моўныя адзінкі праз іх суадносіны з лагічнымі катэгорыямі?

А Платон;
Б.Арыстоцель;
В.Піфагор;
Г. Дыяген.

2. Хто з лінгвістаў прадстаўляе логіка-граматычны напрамак у расійскім мовазнаўстве XIX стагоддзя?

А. А. А. Шахматаў;
Б. Ф. І. Буслаеў;
В. І. І. Сразнеўскі;
Г.І. І. Мешчанінаў.

3. Якія новыя рысы набывае лагічнае мовазнаўства ў XIX стагоддзі ў параўнанні з мовазнаўствам перыяду напісання “Універсальнай і рацыянальнай граматыкі”?

А. Прызнанне лексемы асноўнай моўнай адзінкай;
Б. Універсальнасць лагічных катэгорый;
В. Увага да нацыянальнай спецыфікі мовы;
Г. Адзінства лагічнага і гістарычнага ў мове.

4. Хто з’яўляецца аўтарам працы “Арганізм мовы”(1827),у якой законы логікі былі ўпершыню прыменены да матэрыялу тагачаснай нямецкай мовы?

А. А. Шлейхер;
Б.К. Бекер;
В. Г. Штэйнталь.

5. Якая праца Ф.І. Буслаева прысвечана даследаванню суадносін мовы і мыслення;

А. “О преподавании отечественного языка”(1844);

Б. “О влиянии христианства на славянский язык”(1844);
В. “Опыт исторической грамматики русского языка”(1858).

6.Якая моўная адзінка прызнаецца асноўным прадметам даследавання ў логіка-граматычным мовазнаўстве?

А. Слова;
Б. Марфема;
В. Сказ;
Г. Словазлучэнне.

7. Укажыце, якія лагічныя катэгорыі адпавядаюць наступным моўным адзінкам (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. Паняцце;
Б. Суджэнне;
В. Выснова;

I. Слова;
II. Просты сказ;
III. Складаны сказ.

8. Якім чынам змяняюцца формы мысленчай дзейнасці чалавека пры пераходзе мовы са старажытнага перыяду развіцця на новы?

А. Спачатку мысленне прымае форму канкрэтна-пачуццёвага (вобразнага) асэнсавання аб’ектыўнай рэчаіснасці, затым – форму абстрактнага мыслення праз агульныя паняцці;
Б. Развіццё форм мысленчай дзейнасці адбываецца ў накірунку ад абстрактнага да канкрэтнага.

9. Якім чынам Ф.І. Буслаеў прапаноўваў пашырыць прадмет гістарычнага даследавання мовы?

А. Уключыць у аб’ект даследавання мёртвыя мовы;

Б. Вывучаць гісторыю мясцовых гаворак.

10. Хто з'яўляецца заснавальнікам псіхалагічнай школы ў мовазнаўстве?

А. В. Гумбальт;
Б. А.Шлейхер;
В. Г. Штэйнталь;
Г. Г. Бекер.

11. Хто заснаваў псіхалагічны напрамак у расійскім мовазнаўстве?

А. А.А. Патабня;
Б. А.А. Шахматаў;
В. І.І. Мешчанінаў;
Г. У.А. Багародзіцкі.

12. Якія законы, на думку Г. Штэйнталя, вызначаюць як паходжанне, так і развіццё мовы?

А. Законы асацыятыўнай псіхалогіі (законы асацыяцыі, асіміляцыі, аперцэпцыі);
Б. Лагічныя законы (напрыклад, адзінства зместу і формы, развіццё мовы ад простых форм да складаных і іншыя);
В. Унутрымоўныя законы (напрыклад, закон адкрытага складу і іншыя).

13. У чым адрозненне паміж псіхалагізмам лінгвістычных канцэпцый В. Гумбальта і Г. Штэйнталя?

А. У канцэпцыі В. Гумбальта перавага аддавалася не псіхалогіі асобнага індывідуума, а псіхалогіі народа, у канцэпціі Г. Штэйнталя, – наадварот;
Б. Г. Штэйнталь разумеў псіхалагізм як уласцівасць інтэлектуальнай дзейнасці грамадства ў цэлым, В. Гумбальт – толькі як індывідуальную ўласцівасць чалавека.

14. Укажыце структуру слова, якую яно мае, на думку А.А. Патабні, у час свайго ўзнікнення.

А. Членападзельны гук, значэнне;
Б. Членападзельны гук, уяўленне, значэнне.

15. Якія змены адбываюцца ў структуры слова ў працэсе гістарычнага развіцця мовы?

А. Губляецца членападзельны гук;
Б. Страчваецца ўяўленне.

16. Як А.А. Патабня разумеў “бліжэйшае” і “далейшае” значэнні слоў?

А. Бліжэйшае значэнне слова з’яўляецца народным, далейшае – асабістым (індывідуальным);
Б. Наадварот.

17. Якія фактары разглядаў А.А. Патабня ў якасці прычыны разбурэння адных граматычных форм і ўтварэння новых?

А. Уплыў іншых моў;
Б. Замена апісальных форм злітнымі;
В. Узнікненне адцягненага мыслення і павелічэнне запасу ведаў.

18. Якое з паняццяў – “значэнне слова” ці “ўяўленне” – шырэйшае, на думку А.А. Патабні?

А. Значэнне шырэйшае за ўяўленне, яно ўключае сукупнасць прымет вобраза, а не адну прымету, як уяўленне;
Б. Уяўленне шырэйшае за значэнне, таму што яно ўключае сукупнасць прымет;
Г. Гэтыя паняцці раўназначныя: колькасць прымет аднолькавая.

19. Ці заўсёды супадае лагічная і граматычная правільнасць сказаў?

А. Заўсёды. Любы лагічна правільны сказ з’яўляецца граматычна правільным;
Б. Не. Сказ можа быць граматычна няправільны, але правільны ў лагічных адносінах, і наадварот.

20. Якія ўласцівасці мовы А.А. Патабня разглядаў як агульначалавечыя?

А. Членападзельнасць мовы;
Б. Наяўнасць граматычных форм;
В. Мова як сістэма сімвалаў, якая служыць думцы;
Г. Стылёвая дыферэнцыяцыя мовы.

21. Якая з’ява ў мовах свету абумоўлена верай людзей у аб’ектыўнае існаванне слова, калі слова не аддзяляецца ад прадмета (з’явы) і адно толькі вымаўленне пэўнага слова само па сабе можа выклікаць тую з’яву, з якой яно звязанае?

А. Полісемія;
Б. Табу;
В. Аманімія;
Г. Сінанімія.

22. Ці з’яўляецца слова адзінай формай выражэння думкі?

А. З’яўляецца. Словам карыстаюцца ўсе без выключэння;
Б. Не з’яўляецца. Думка можа выражацца музычнымі тонамі, фарбамі, графічнымі сродкамі і інш.

23. У чым адрозненне паміж тыпалагічнай класіфікацыяй В. Гумбальта і А. Шлейхера?

А. В. Гумбальт вылучаў інкарпарыруючыя мовы, якіх не вылучаў А. Шлейхер;

Б. У класіфікацыі В. Гумбальта адсутнічаюць аглютынацыйныя мовы;

В. А. Шлейхер уключыў у каранёвыя мовы разам з кітайскай бірманскую мову;

Г. У класіфікацыі А. Шлейхера адсутнічаюць флексійныя мовы.

24. У якіх працах А. Шлейхера з найбольшай паўнатой адлюстравана натуралістычная канцэпцыя мовы?

А. "Кампендый параўнальнай граматыкі індаеўрапейскіх моў" (1861-1862);

Б. "Тэорыя Дарвіна ў прымяненні да навукі аб мове" (1863);

В. "Значэнне мовы для натуральнай гісторыі чалавека" (1865);

Г. "Мовы Еўропы ў сістэматычным асвятленні" (1850).

25. Якім чынам класіфікацыя прыродазнаўчых навук, на думку А. Шлейхера, праецыруецца на лінгвістычную? (Для літар першага інфармацыйнага блока падбярыце адпаведныя лічбы з другога інфармацыйнага блока).

А. Род;
Б. Від;
В. Падвід.

I. Мовы;
II. Дыялекты;
III. Прамова.

26. Якія тэрміны прыродазнаўчых навук выкарыстаў А. Шлейхер у сваёй натуралістычнай канцэпцыі?

А. Ядро, корань;
Б. Сям'я, галіна;
В. Дрэва, арганізм;
Г. Суквецце.

27. Якія перыяды ў развіцці моў вылучаў А. Шлейхер?

А. Дагістарычны, гістарычны перыяды;
Б. Старажытны, сярэдні, новы перыяды.

28. Ці дапускаў А. Шлейхер магчымасць скрэшчвання моў або дыялектаў у працэсе дыферэнцыяцыі моў-асноў?

А. Дапускаў. Скрэшчванне моў – натуральны працэс
Б. Не дапускаў. Дыферэнцыяцыя моў-асноў адбываецца без скрэшчвання.

29. У чым заключаецца асноўная заслуга А. Шлейхера?

А. Уяўленне аб мове як грамадскай з’яве;
Б. Стварэнне схемы генеалагічнага дрэва індаеўрапейскіх моў;
В. Распрацоўка методыкі рэканструкцыі старажытных праформ;
Г. Стварэнне вучэння аб граматычнай форме.

30. Назавіце асноўныя недахопы лінгвістычнай канцэпцыі А. Шлейхера.

А. У мове дзейнічаюць законы прыродазнаўчых навук;
Б. Мова не мае грамадскага характару;
В. Флексійныя мовы – самыя дасканалыя;
Г. Мова – несістэмная з’ява;
Д. Скрэшчванне моў не з’яўляецца фактарам моўнай дыферэнцыяцыі;
Ж. У аснове генеалагічнай класіфікацыі – прынцып роднасці моў.

## Тэст № 5

1.Хто з даследчыкаў мовы ў сярэдзіне XIX стагоддзя прапанаваў ідэю калектыўнай псіхалогіі, або этнапсіхалогіі?

А. А. А Патабня;
Б. Г. Штэйнталь;
В. Ф. І. Буслаеў;
Г. А. Шлейхер.

2.Калі ў мовазнаўстве ўзнік такі лінгвістычны напрамак, як младаграматызм?

А. XVI–XVII стагоддзі;
Б. Канец XVIII стагоддзя;
В. 2-ая палова XIX стагоддзя;
Г. Пачатак XX стагоддзя.

3. З імёнамі якіх лінгвістаў звязана ўзнікненне младаграматызму?

А. Г Штэйнталь, А. А Патабня, А Шлейхер;
Б К. Бругман, Г Остгаф, Г. Пауль;
В. А. Вастокаў, І. Сразнеўскі, Ф. Буслаеў;
Г. Б. Дэльбрук, А. Лескін.

4. Што,на думку младаграматыкаў, павінна ўключацца ў прадмет даследавання мовазнаўства?

А.Індывідуальнае маўленне чалавека;
Б. Мова пісьмовых помнікаў;
В. Дыялекты;
Г. Жывыя мовы;
Д. Мёртвыя мовы.

5. Якія прынцыпы лінгвістычнага даследавання младаграматыкі лічылі важнейшымі;

А. Прынцып гістарызму;
Б. Лагічны прынцып;

В. Прынцып індывідуальнага псіхалагізму.

6. Ці прызнавалі маладграматыкі існаванне этнапсіхалінгвістыкі?

А. Прызнавалі. Псіхічная дзейнасць чалавека звязана з псіхічнай дзейнасцю грамадства ў цэлым;
Б Не прызнавалі. Псіхічная дзейнасць існуе толькі ў душы індывіда.

7. Якія законы, на думку маладграматыкаў, абумоўліваюць функцыянаванне і развіццё мовы?

А. Лагічныя законы;
Б. Законы прыродазнаўчых навук;
В. Фанетычныя законы;
Г. Закон утварэння форм па аналогіі.

8. У якой са сфер псіхікі захоўваюцца, на думку Г. Пауля, усе моўныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў маўленчай дзейнасці?

А. Сфера свядомасці;
Б. Сфера падсвядомасці.

9. Што такое узус, паводле маладграматычнай канцэпцыі?

А. Агульнапрынятыя нормы выкарыстання мовы;
Б. Стыль;
В. Граматычны лад мовы;
Г. Фанетычная сістэма мовы

10. Якія віды змен моўнага узусу вылучалі маладграматыкі?

А. Станоўчыя змены;
Б. Адмоўныя змены;
В. Станоўчыя і адмоўныя змены адначасова.

11. У чым заключаецца сутнасць маладграматычнай тэорыі моўнай неперарыўнасці?

А. Пэўны від змен моўнага узусу адпавядае пэўнай генерацыі (пакаленню) носьбітаў мовы, якія спачатку актыўна валодаюць мовай, затым – пасіўна, і нарэшце, цалкам губляюць мову;

Б. Характар змен моўнага узусу не залежыць ад пэўнай генерацыі носьбітаў мовы. Мова развіваецца шляхам трансфармацыі адной мовы ў другую;

В. Флексійны тып мовы ўзнік з аглютынацыйнага, аглютынацыйны – з аморфнага тыпу.

12. Якія віды значэнняў у слове вылучаў Г. Пауль?

А. Матываваныя, нематываваныя значэнні слова;
Б. Вобразныя, нявобразныя значэнні слова;
В. Узуальныя, аказіянальныя значэнні слова;
Г. Бліжэйшыя, далейшыя значэнні слова.

13. Ці заўсёды супадаюць "псіхалагічны дзейнік" і "псіхалагічны выказнік" з граматычным дзейнікам і граматычным выказнікам?

А. Заўсёды;
Б. Не заўсёды.

14. Якія тыпы змен у значэнні слоў адзначаў Г. Пауль?

А. Звужэнне, пашырэнне значэння слова;
Б. Перанос значэння на аснове асацыятыўных сувязей падабенства і сумежнасці;
В. "Паляпшэнне" або "пагаршэнне" значэння слоў.

15. Хто з'яўляецца аўтарам працы "Прынцыпы гісторыі мовы" (1880), якая тэарэтычна абагульняе погляды прадстаўнікоў младаграматызму?

А. А. Шлейхер;
Б. Ф. Сасюр;
В. Г. Пауль;

Г. В. Гумбальт.

16. Хто першым у мовазнаўстве ўказаў на ролю аналогіі ў развіцці мовы?

А. Я. Брэдсдорф;
Б. Б. дэ Куртэнэ;
В. Р. Раск;
Г. Я. Грым.

17. Назавіце прадстаўнікоў Маскоўскай лінгвістычнай школы (МЛШ)?

А. А.А. Шахматаў, М.М. Пакроўскі;
Б. П. П. Фартунатаў, Б.М. Ляпуноў;
В. М. Фасмер, В.К. Паржэзінскі;
Г. І.І. Сразнеўскі, А.Х. Вастокаў, Ф.І. Буслаеў.

18. Якія функцыі, на думку П. Фартунатава, выконвае мова ў адносінах да мыслення?

А. Мова – сродак для выражэння думак;
Б. Мова – прылада мыслення;
В. Мова – і сродак для выражэння думак, і прылада мыслення.

19. Якія элементы выдзяляў П. Фартунатаў у структуры суджэння?

А. Дзейнік і выказнік;
Б. Атрыбут і класіфікатар дзеяння;
В. Суб’ект, аб’ект, прэдыкат.

20. Як разумелася прадстаўнікамі МЛШ форма слова?

А. Форма слова – спосаб прадстаўлення лексічнага значэння;
Б. Форма слова – здольнасць слова вылучаць з сябе фармальную і асноўную прыналежнасці;

В. Форма слова – гукавая абалонка слова;

Г. Форма слова – спосаб прадстаўлення граматычнага значэння.

21. Якое азначэнне атрымала словазлучэнне ў лінгвістычнай канцэпцыі П. Фартунатава?

А. Словазлучэнне – спалучэнне слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю;

Б. Словазлучэнне – спалучэнне слоў, звязаных злучальнай сувяззю;

В. Словазлучэнне – спалучэнне слоў, звязаных злучальнай або падпарадкавальнай сувяззю;

Г. Словазлучэнне – спалучэнне аднаго слова з другім у сказе, у адрозненне ад асобных слоў.

22. Як, на думку П. Фартунатава, падзяляюцца словазлучэнні?

А. Закончаныя і незакончаныя словазлучэнні;

Б. Простыя і складаныя словазлучэнні;

В. Іменныя і дзеяслоўныя словазлучэнні;

Г. Прыназоўнікавыя і безназоўнікавыя словазлучэнні.

23. Назавіце моўныя знакі, якія , паводле П. Фартунатава, выкарыстоўваюцца для выражэння пачуццяў.

А. Безасабова-прэдыкатыўныя словы;

Б. Выклічнікі;

В. Словы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі.

24. Каму з лінгвістаў належыць т.зв. тэорыя псіхалагічнай камунікацыі?

А. А.А. Патабня;

Б. А.А. Шахматаў;

В. П. Фартунатаў;

Г. Г. Штэйнталь.

25. Як разумелася сутнасць паняцця “камунікацыя” прадстаўнікамі МЛШ?

А. Камунікацыя – сам працэс зносін;
Б. Камунікацыя – акт мыслення з мэтай паведамлення (давербальны этап).

26. Хто з вучняў П. Фартунатава ўпершыню ў мовазнаўстве распрацаваў асновы параўнальна-гістарычнай семасіялогіі?

А. Н.М. Пакроўскі;
Б. А.А. Шахматаў;
В. Б.М. Ляпуноў.

27. Хто з прадстаўнікоў МЛШ увёў паняцце “сістэмнасць” у лексіку?

А. П. П. Фартунатаў;
Б. А.А. Шахматаў;
В. М.М. Пакроўскі;
Г. Б.М. Ляпуноў.

28. Сінтаксічнае вучэнне каго з лінгвістаў можна ахарактарызаваць як псіхалагічны сінтаксіс?

А. А.А. Патабня;
Б. Г. Пауль;
В. А.А. Шахматаў;
Г. Г. Штэйнталь.

## Тэст №6.

1. Хто ўвёў у навуковы ўжытак тэрміны “фанема”, “марфема”, “лексема”?

А. П. П. Фартунатаў;
Б. Б. дэ Куртэнэ;
В. А.А. Патабня;
Г. А.А. Шахматаў.

2. Назавіце прадстаўнікоў Казанскай лінгвістычнай школы (КЛШ).

А. Г. Штэйнталь, А.А. Патабня, Г. Пауль;
Б. П. П. Фартунатаў, А.А. Шахматаў, М.М. Пакроўскі;
В. Б. дэ Куртэнэ, Н.В. Крушэўскі, В.А. Багародзіцкі;
Г. І.І. Сразнеўскі, А.Х. Вастокаў, Ф.І. Буслаеў.

3. Як Б. дэ Куртэнэ разумеў сутнасць мовы?

А. Мова – з’ява сацыяльная;
Б. Мова – з’ява псіхічная;
В. Не існуе мовы соцыума, ёсць толькі мова індывідуума;
Г. Мова – псіхасацыяльная з’ява.

4. Якія рысы, на думку Б. дэ Куртэнэ, характарызуюць “мову” жывёл (у адрозненне ад мовы чалавека)?

А. Нязменнасць;
Б. Абстрактнасць, членападзельнасць;
В. Здольнасць да мадыфікацыі форм;
Г. Непасрэднасць, неабходнасць.

5. У чым заключаецца сутнасць полігенетычнай тэорыі мовы?

А. Як паходжанне ўсіх людзей ад адной пары не можа быць фактам навукі, так і пачатак мовы нельга зводзіць да нейкага старажытнага агульнага, аднолькавага стану;

Б. Усе мовы ўзніклі ад адной мовы-прамовы (а не ад некалькіх моў-прамоў) у выніку яе расшчаплення.

6. Якія тыпы змен у марфалагічнай структуры слоў у працэсе гістарычнага развіцця мовы выдзяляў В. А. Багародзіцкі?

А. Ускладненне, нарашчэнне;
Б. Апрошчанне, перараскладанне;
В. Накладанне, чаргаванне;
Г. Аналогія, дыферэнцыяцыя.

7. Які прынцып лінгвістычнага даследавання Б. дэ Куртэнэ лічыў важнейшым?

А. Лагічны прынцып;
Б. Гістарычны прынцып;
В. Храналагічны прынцып.

8 Якія тыпы адносін у моўнай сістэме вылучаў Н. В. Крушэўскі?

А. Асацыяцыі па сумежнасці;
Б. Асацыяцыі па падабенстве;
В. Адносіны матэрыяльнай залежнасці паміж моўнымі адзінкамі розных узроўняў;
Г. Генетычныя адносіны.

9 Якія паняцці выкарыстоўваў Б. дэ Куртэнэ для характарыстыкі мовы як з'явы, у якой "пануе бесперапыннае змяненне, вечны рух"?

А. Сістэма і структура;
Б. Сінтагматыка і парадыгматыка;
В. Сінхранія і дыяхранія;
Г. Статыка і дынаміка.

10.Як разумеецца Бадуэнам дэ Куртэнэ сістэма мовы?

А. Сістэма мовы – гукавая і графічная абалонкі мовы;

Б. Сістэма мовы – дакладна вызначаная іерархія граматычных форм;

В. Сістэма мовы – сукупнасць моўных адзінак, часткі якой звязаны паміж сабой адносінамі значэння, формы, гучання.

11. Як Б. дэ Куртэнэ вызначаў сутнасць паняцця "пласт мовы"?

А. Моўны ўзровень сучаснай мовы наогул (напр, фанетычны);

Б. Моўныя вынікі ранейшых перыядаў, прыкметныя ў дадзеным стане мовы;

В. Сукупнасць лексічных адзінак мовы.

12. Якія віды фанем вылучаў Б. дэ Куртэнэ?

А. Кагерэнты, дывергенты;

Б. Субстытуты, дыстынктары;

В. Карэляты, карэспандэнты.

13. Як прадстаўнікі КЛШ ставіліся да марфалагічных (тыпалагічных) класіфікацый папярэдніх эпох?

А. Станоўча. Моўнае развіццё ўяўляе сабой трансфармацыю менш дасканалых тыпаў моў у больш дасканалыя;

Б. Адмоўна. Няма падстаў лічыць адзін марфалагічны тып моў ніжэйшым за іншы, і наадварот.

14. Марфалагічныя класіфікацыі якіх даследчыкаў мовы меліся на ўвазе прадстаўнікамі КЛШ?

А. А. Шлейхера;

Б. Ф. Бопа;

В. В Гумбальта;

Г. Я. Грыма;

15. Якія фактары вызначаюць, на думку Б. дэ Куртэнэ, “знешнюю гісторыю мовы”?

А. Унутраныя заканамернасці мовы;
Б. Уплыў замежных моў;
В. Род заняткаў носьбітаў мовы;
Г. Геаграфічныя ўмовы краіны;
Д. Літаратурная апрацоўка мовы.

16. У чым праяўляецца “двухбаковая псіхічная сутнасць моўнага знака”?

А. Ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці двух яго элементаў: паняцця і акустычнага вобраза;
Б. У сувязі моўнага знака з індывідуальным маўленнем і мовай грамадства;
В. У сувязі моўнага знака з пазамоўнымі і ўнутрымоўнымі з’явамі.

17. Як Ф. дэ Сасюр разумеў “адвольнасць моўнага знака”?

А. Як абсалютную свабоду выбару азначальнага тым, хто гаворыць;
Б. Як нематываванасць азначальнага да азначаемага.

18. Ці з’яўляюцца гукаперайманні “абсалютна матываванымі”?

А. Не з’яўляюцца. Матываванасць гукаперайманняў абмежавана рамкамі нацыянальнай мовы;
Б. З’яўляюцца. У кожнай мове гукаперайманні захоўваюць натуральную сувязь азначальнага і азначаемага.

19. Якая мова з прыведзеных ніжэй лічыцца “ультралексічнай”? А “ультраграматычнай” (па Ф. дэ Сасюру)?

А. Санскрыт;
Б. Англійская мова;
В. Нямецкая мова;

Г. Кітайская мова.

20. У чым праяўляецца "канцэптуальны аспект значымасці моўнага знака"?

А. Значэнне слова (яго семантычны аб'ём) як моўнага знака ў лексічнай сістэме адной мовы можа не супадаць са значэннем гэтага ж слова ў другой мове;
Б. Значэнне розных слоў у лексічных сістэмах розных моў можа супасці.

21. У чым Ф. дэ Сасюр бачыў "матэрыяльны аспект значымасці моўнага знака"?

А. У існаванні матэрыяльна выражаных графічнай і фанетычнай сістэм мовы;
Б. У наяўнасці (адсутнасці) матэрыяльных элементаў для выражэння пэўнай граматычнай формы слова ў сістэме іншых граматычных форм гэтага ж слова.

22. Якім тыпам адносін у канцэпцыі Ф. дэ Сасюра адпавядаюць "асацыяцыі па сумежнасці" і "асацыяцыі па падабенстве", прапанаваныя М.В. Крушэўскім?

А. Сінтагматычным і асацыятыўным адносінам;
Б. Семантычным і генетычным адносінам;
В. Адносінам матэрыяльнай залежнасці.

23. Укажыце асноўныя рысы "сінтагмы".

А. Падабенства паміж членамі "сінтагмы";
Б. Наяўнасць у структуры мінімум дзвюх адзінак;
В. Лінейная паслядоўнасць моўных адзінак.

24. Якія адносіны звязваюць членаў "асацыятыўнага рада"?

А. Падабенства па форме;
Б. Падабенства па значэнні;
В. Падабенства і па форме, і па значэнні.

25. Ці адпавядаюць паняцці “статыка” і “дынаміка”, прапанаваныя Б. дэ Куртэнэ, паняццям “сінхранія” і “дыяхранія”, уведзеным Ф. дэ Сасюрам?

А. Адпавядаюць. Усе гэтыя паняцці характарызуюць мову як зменлівую з’яву;

Б. Не адпавядаюць у поўным аб’ёме. Паняцці “сінхранія” (стан мовы) і “дыяхранія” (фаза эвалюцыі мовы) – шырэйшыя за паняцці “статыка” і “дынаміка”, паколькі стан мовы адначасова характарызуецца і адноснай устойлівасцю, і дынамікай моўных адзінак;

В. Не адпавядаюць. Паняцці “статыка” і “дынаміка” – шырэйшыя за паняцці “сінхранія” і “дыяхранія”.

26. Якія фактары Ф. дэ Сасюр адносіць да “знешнелінгвістычных”?

А. Моўныя універсаліі;

Б. Унутраную палітыку дзяржавы;

В. Палітычную гісторыю;

Г. Межы геаграфічнага пашырэння мовы;

Д. Драбненне мовы на дыялекты;

Ж. Функцыянальна-стылявое чляненне мовы.

27. Якую прыроду ,на думку Ф. дэ Сасюра, мае маўленне?

А. Маўленне – псіхічная з’ява;

Б. Маўленне – фізічная з’ява;

В. Маўленне – адначасова і фізічная, і фізіялагічная, і псіхічная з’ява.

28. Хто з’яўляецца заснавальнікам сацыялагічнага напрамку ў мовазнаўстве?

А. Ш. Балі;

Б. А. Сешэ;

В. Ф. дэ Сасюр;

Г. А. Мее.

29. Якія часткі Ф. дэ Сасюр вылучаў у структуры маўленчай дзейнасці?

А. Мову і маўленне;
Б. Сінхранію і дыяхранію;
В. Статыку і дынаміку;
Г. Літаратурную мову і дыялекты;
Д. Граматычную форму і змест.

30. Як Ф. дэ Сасюр назваў навуку, якая "вывучае жыццё знакаў у межах жыцця грамадства"?

А. Сацыялогія;
Б. Семіялогія;
В. Семіётыка;
Г. Семантыка.

31. Ці можна пагадзіцца з наступным тэзісам Ф. дэ Сасюра: " мова ёсць сістэма, якая падпарадкоўваецца толькі свайму ўласнаму парадку"?

А. Можна. Мова жыве па сваіх законах;
Б. Нельга. Пазамоўныя фактары істотна ўплываюць на мову.

## Тэст №7

1. Каму з французскіх матэрыялістаў належыць наступны тэзіс: “мова не можа быць аддзелена ад свайго сацыяльнага асяроддзя так жа, як расліна не можа быць адарвана ад уласцівага ёй асяроддзя кліматычнага”?

А. О. Конт;
Б. П. Лафарг;
В. В. Дзюркгейм.

2. Чым, на думку А. Мее, абумоўлены моўныя змены?

А. Фанетычнымі законамі;
Б. Законам па аналогіі;
В. Сацыяльнымі фактарамі.

3. Хто з даследчыкаў мовы ў 2-ой палове XIX стагоддзя прапанаваў сацыяльна-гістарычную тэорыю паходжання мовы, у адпаведнасці з якой мова ўзнікла разам з чалавечым грамадствам як неабходны сродак зносін у працэсе іх сумеснай вытворчай дзейнасці?

А Ф. Энгельс;
Б. Ф. Сасюр;
В. Г. Пауль.

4. Што такое субстрат?

А. Моўны саюз;
Б. Вынік моўных кантактаў, калі народ пераймае мову пераможцаў і губляе сваю родную мову;
В. Старажытны лексічны пласт у сучаснай мове.

5. У выніку якіх моўных працэсаў, паводле А. Мее, утварыліся самастойныя мовы з індаеўрапейскай прамовы?

А. Працэсаў дыферэнцыяцыі і уніфікацыі;

Б. Працэсаў асіміляцыі і дысіміляцыі;
В. Працэсаў акамадацыі і чаргавання.

6. Ці згаджаўся А. Мее з младаграматыкамі, якія лічылі, што гукавыя змены з'яўляюцца індывідуальнымі па паходжанні і распаўсюджваюцца ў грамадстве ў выніку імітавання?

А. Згаджаўся. Гукавыя змены першапачаткова носяць індывідуальны характар;
Б. Не згаджаўся. Гукавыя змены абумоўлены сацыяльнымі фактарамі і не могуць быць індывідуальнымі па паходжанні.

7. Назавіце асноўныя разнавіднасці структуралізму як лінгвістычнага напрамку.

А. Младаграматызм;
Б. Пражская функцыянальная лінгвістыка;
В. Кампаратывістыка;
Г. Гласематыка;
Д. Амерыканская дэскрыптыўная лінгвістыка.

8. Хто з моваведаў увёў у навуковы ўжытак тэрмін "фанема"?

А. Б. дэ Куртэнэ;
Б. Л. У.Шчэрба;
В. Ф. дэ Сасюр;
Г. А. Мее.

9. Хто з'яўляецца заснавальнікам Пражскага лінгвістычнага гуртка (Пражскай функцыянальнай лінгвістыкі)?

А. Б. дэ Куртэнэ;
Б. В. Матэзіус;
В. Б. Трнка;
Г. Б. Гаўранэк.

10. Назавіце вядомых рускіх лінгвістаў, якія прымалі актыўны ўдзел у рабоце Пражскага лінгвістычнага гуртка(ПЛГ).

А. Я. Мукаржоўскі;
Б. М. С. Трубяцкой;
В. С. О. Карцэўскі;
Г. Р. В. Якабсон;
Д. В. Скалічка.

11. У чым пражскія лінгвісты бачылі адрозненне паміж практычнай і тэарэтычнай мовамі?

А. Практычная мова звязана з пазамоўнымі фактарамі: жэстамі, мімікай, сітуацыяй зносін, вопытам людзей;
Б. Практычная мова не звязана з сітуацыяй зносін;
В. Практычная мова з’яўляецца мовай фармулёвак.

12. Вызначце адпаведнасць паміж “функцыямі маўленчай дзейнасці” і “функцыянальнымі мовамі”, паводле лінгвістычных канцэпцый прадстаўнікоў ПЛГ.

А. Практычна спецыяльная функцыя;
Б. Тэарэтычна спецыяльная функцыя;
В. Эстэтычная функцыя;
Г. Камунікатыўная фукцыя.

I. Размоўная мова;
II. Паэтычная мова;
III. Мова навуковай літаратуры;
IV. Мова дзелавых зносін.

13. У чым сутнасць пражскай тэорыі “актуалізацыі” моўных сродкаў?

А. Актуалізацыя – ужыванне ў паэзіі моўных сродкаў толькі сучаснага для чытача храналагічнага зрэзу мовы;
Б. Актуалізацыя – такое выкарыстанне моўных сродкаў у паэтычнай мове, якое прыцягвае ўвагу само па сабе і ўспрымаецца як незвычайнае, пазбаўленае аўтаматызму.

14. Укажыце рысы літаратурнай мовы, паводле даследаванняў пражскіх лінгвістаў.

А. Літаратурная апрацаванасць мовы мастакамі слова;

Б. Устойлівасць як неабходнасць пазбавіцца ад усіх непатрэбных адхіленняў;

В. Здольнасць выражаць самыя разнастайныя адценні значэнняў;

Г. Своеасаблівасць мовы г. зн. узмацненне тых рыс мовы, якія абумоўліваюць яе спецыфіку.

Д. Стылёвая дыферэнцыяцыя.

15. Хто з моваведаў з’яўляецца заснавальнікам фаналогіі як лінгвістычнай дысцыпліны?

А. П. П. Фартунатаў;

Б. М. С. Трубяцкой;

В. Б дэ Куртэнэ;

Г. Ф. дэ Сасюр.

16. У чым заключаецца дыстынктыўная функцыя фанем?

А. Адрозніваюць моўныя адзінкі па сэнсе;

Б. Указываюць мяжу паміж моўнымі адзінкамі;

В. Паказваць колькасць слоў і словазлучэнняў у сказе.

17. Якія з прыведзеных ніжэй апазіцый можна лічыць фаналагічнымі(фаналагічна-дыстынктыўнымі)?

А. Сам – сом;

Б. Сам – сом;

В. Сын – сон;

Г. Сын – сон;

Д. Кот –кут;

Ж. Вал – вол;

З. Сук – лук;

К. Кол – вол.

18. Укажыце прыклады, для якіх акустычная прымета "глухасць – звонкасць" з'яўляецца фаналагічна істотнай.

А. Цір – пір;
Б. Жар – пар;
В. Гол – вол;
Г. Гол – хол;
Д. Дом – том;
Ж. Зеў – сеў.

19. Што, на думку М. С. Трубяцкога, уяўляюць сабой варыянты фанемы?

А. Фаналагічна істотныя і фаналагічна неістотныя прыметы фанемы;
Б. Фізічна розныя гукі, у якіх рэалізуецца адна і тая ж фанема.

20. Якія тыпы варыянтаў фанем вылучаюць пражскія лінгвісты?

А. Абавязковыя, факультатыўныя, індывідуальныя варыянты фанем;
Б. Дыстынктары, субстытуты, канструкты.

21. Суаднясіце прыведзеныя прыклады з адпаведнымі відамі варыянтаў фанем.

А. Грыба (Р. скл.) – грыбу (Д. скл.);
Б. Сакратар – сакратарка –сакратарша;
В. Дом –дамы, рэчка –рака;

I. Пазіцыйныя варыянты;
II. Камбінаторныя варыянты;
III. Стылістычныя варыянты.

22. Вызначце тыпы фаналагічных апазіцый у наступных прыкладах.

А. Сад – садовы – садаводства – садавіна;
Б. Брыз – прыз, дзень – цень;
В. Сом – том, кок – ток;

I. Прыватныя апазіцыі;
II. Градуальныя апазіцыі;
III. Эквіпалентныя апазіцыі.

23. Укажыце прыклады, якія ілюструюць нейтралізацыю фаналагічных апазіцый.

А. Грыб – грып;
Б. Дом – дым;
В. Казка – каска;
Г. Сон – сан.

24. Што такое карэляцыя, паводле фаналагічных даследаванняў М. С. Трубяцкога?

А. Сукупнасць канкрэтных гукаў, у якіх можа рэалізавацца адна і тая ж фанема.
Б. Апазіцыя, якая адначасова з’яўляецца аднамернай, прапарцыянальнай і прыватыўнай.
В. Сукупнасць фанем, здольных замяшчаць адна адну ў межах адной і той жа марфемы.

25. Як называецца раздзел фаналогіі, які даследуе марфалагічнае выкарыстанне фаналагічных сродкаў мовы?

А. Фанетыка;
Б. Марфеміка;
В.Марфалогія;
Г. Марфаналогія.

26. Каму з пражскіх структуралістаў належыць тэорыя актуальнага члянення сказа?

А. В.Матэзіус;
Б. В. Скалічка;

В. М. С. Трубяцкой;
Г. Б. Гаўранэк.

27. Хто з прадстаўнікоў ПЛГ распрацаваў сістэму склонаў з улікам такіх семантычных прымет, як накіраванасць, аб'ёмнасць, перыферыйнасць?

А. Р. В. Якабсон;
Б. В. Матэзіус;
В. М. С. Трубяцкой;
Г. С. О. Карцэўскі.

28. Чым моўны саюз адрозніваецца ад моўнай сям'і?

А. Моўны саюз – група геаграфічна сумежных няроднасных моў, якія характарызуюцца пэўным падабенствам у сінтаксісе, марфалогіі ці фаналогіі;
Б. Моўны саюз – група геаграфічна сумежных блізкароднасных моў з элементамі падабенства на розных моўных узроўнях;
В. Моўная сям'я – група роднасных моў, як геаграфічна сумежных, так і несумежных, якія характарызуюцца пэўным падабенствам;
Г. Моўная сям'я – група блізкароднасных моў, геаграфічна сумежных, якія вызначаюцца агульным фондам марфем.

29. Хто з пражскіх структуралістаў вылучыў тыпалагічныя прыметы, уласцівыя для ўсіх індаеўрапейскіх моў?

А. М. С. Трубяцкой;
Б. В. Матэзіус;
В. В. Скалічка;
Г. Р. О. Якабсон.

30. Ці з'яўляецца сінгарманізм характэрнай рысай індаеўрапейскіх моў?

А. Так;
Б. Не.

## Тэст № 8

1. Хто ўвёў у навуковы ўжытак лінгвістычны тэрмін “сема” як асноўную мінімальную адзінку граматычнай сістэмы?

А. В. Матэзіус;
Б. В. Скалічка;
В. М. С. Трубяцкой;
Г. Р. В. Якабсон.

2. Якую лінгвістычную тэорыю называюць іманентнай алгебрай мовы?

А. Гласематыку;
Б. Тэорыю актуальнага члянення сказа;
В. Тэорыю актуалізацыі моўных сродкаў у паэтычнай мове;
Г. Тэорыю моўнага знака.

3. Назавіце прадстаўнікоў Капенгагенскай школы структуралізму.

А. В. Брондаль, Х. Ульдаль, Л. Ельмслеў;
Б. Б. Трнка, Б. Гаўранэк, Й. Вахек;
В. К. Бругман, Г. Пауль,А. Ляскін.

4. Каму належыць выказванне: “Адзіным і сапраўдным аб’ектам лінгвістыкі з’яўляецца мова, якая разглядаецца ў самой сабе і для сябе”?

А. Ф. дэ Сасюру;
Б. Б. дэ Куртэнэ;
В. Л. Ельмслеву;
Г. В. Матэзіусу.

5. Хто з’яўляеца аўтарам працы “Пралегамены да тэорыі мовы”?

А. Г. Пауль;

Б. Л. Ельмслеў;
В. Ф. дэ Сасюр;
Г. Р. В. Якабсон.

6. Якія дыхатаміі характарызуюць гласематычную тэорыю?

А. Форма – субстанцыя;
Б. Змест – выражэнне;
В. Сацыяльнае – індывідуальнае;
Г. Аб’ектыўнае – суб’ектыўнае.

7. Што такое камутацыя?

А. Адсутнасць змен у плане выражэння;
Б. Адносіны паміж планам выражэння і планам зместу, пры якіх змены ў плане выражэння выклікаюць змены ў плане зместу;
В. Адсутнасць змен у плане зместу.

8. Што такое субстытуцыя?

А. Узаемазамяняльнасць элементаў плана выражэння без змен у плане зместу;
Б. Матэрыяльная форма выражэння зместу наогул.

9. Укажыце прыклады інварыянтаў.

А. <г>орад – <γ>орад;
Б. с<а>м – с<о>м;
В. <г>ол – <х>ол.

10. Які тэрмін Л. Ельмслеў прапанаваў выкарыстоўваць у значэнні мінімальнай адзінкі ў семантыцы мовы?

А. Сема;
Б. Марфема;
В. Фігура;
Г. Лексема.

11. Вызначце тыпы функцый паміж наступнымі функтывамі.

А. Прыметнік і назоўнік;
Б. Дзеяслоў і прыслоўе;
В. Галоўная і дададзеная часткі сказа;
Г. Зычныя і галосныя;
Д. Асоба дзеяслова і род дзеяслова;
Ж Склон і лік назоўнікаў;

I. Інтэрдэпэндэнцыя;
II. Дэтэрмінацыя;
III. Канстэляцыя.

12. Па наступных фігурах вызначце словы.

А. {Жывёла} + {дзікая} + {буры колер} + {любіць мёд};
Б. {Дрэва} + {лісцевае}+{белы ствол};
В. {Жывёла} + {свойская} + {рагатая} + {буйная} + {дае малако}.

13. Ці разглядаў Л. Ельмслеў мову як спецыфічную семіятычную сістэму?

А. Так. Мова з'яўляецца універсальнай і натуральнай семіятычнай сістэмай. Усе астатнія семіятычныя сістэмы вытворныя і штучныя.
Б. Не. Мова як семіятычная сістэма не валодае ніякімі спецыфічнымі рысамі, якія б не былі адзначаны ў іншых семіятычных сістэмах.

14. Які прынцып павінен быць вядучым пры вызначэнні моўных з'яў, паводле даследаванняў гласематыкаў?

А. Дэдукцыя;
Б. Індукцыя.

15. Ці з'яўляецца субстанцыя, на думку Л. Ельмслева, неабходнай перадумовай існавання моўнай формы?

А. Так. Субстанцыя вызначае форму;
Б. Не. Моўная форма вызначае субстанцыю

16. Тэарэтычныя погляды якога мовавeда сталі падмуркам для ўзнікнення і развіцця амерыканскай дэскрыптыўнай лінгвістыкі?

А. Л. Блумфілда;
Б. Л. Ельмслева;
В. А. Марцінэ;
Г. А. Мее.

17. У чым сутнасць гіпотэзы “лінгвістычнай адноснасці” Э. Сепіра і Б. Уорфа?

А. Людзі ўспрымаюць сусвет па-рознаму – праз прызму сваёй роднай мовы. Адрозненні паміж рознымі культурамі абумоўлены адрозненнямі ў мовах народаў-носьбітаў.
Б. Розныя формы мысленчай дзейнасці розных народаў абумоўліваюць існаванне розных моў.

18. Якім чынам, на думку дэскрыптывістаў, рэалізуецца камунікатыўная фукцыя мовы?

А. Як ланцуг стымулаў прамоўцы і рэакцый слухача, апасродкаваны маўленчым актам;
Б. Як універсальная функцыя мовы быць сродкам зносін у грамадстве.

19. Як у дэскрыптывістыцы вырашалася праблема моўнага значэння?

А. Моўнае значэнне не залежыць ад сітуацыі зносін і фіксуецца слоўнікамі.
Б. Моўнае значэнне з’яўляецца сітуацыйна абумоўленым, а паколькі сітуацый – вялікае мноства і іх усе нельга ўлічыць, то можна наогул ігнараваць значэнне.

20 Якія ўзроўні ў мове вылучаў Л. Блумфілд?

А. Фаналагічны ўзровень;
Б. Семантычны ўзровень;
В. Марфаналагічны ўзровень;
Г. .Фразеалагічны ўзровень.

21. Што такое дыстрыбуцыя?

А. Сукупнасць усіх акружэнняў элементаў, у якіх гэтыя элементы сустракаюцца;
Б. Замена адных элементаў другімі без змены сэнсу;
В. Замена элементаў, якая выклікае дыферэнцыяцыю значэнняў.

22. Якія мадэлі дыстрыбуцыі вылучаюцца ў дэскрыптыўнай лінгвістыцы?

А. Эліпсіс;
Б. Кантрастная дыстрыбуцыя;
В. Дапаўняльная дыстрыбуцыя;
Г. Свабоднае вар'іраванне.

23. Што ўяўляе сабой сегментацыя выказвання?

А. Падзел выказвання на найдрабнейшыя элементы;
Б. Аб'яднанне сегментаў у пэўныя класы у межах фаналагічнага ўзроўню.

24. Якія з прыведзеных прыкладаў з'яўляюцца ілюстрацыяй свабоднага вар'іравання на марфалагічным узроўні?

А. Ляч-у – ляц-е-ць, наш-у – нас-і-ць;
Б. Ваўч-ых-а – ваўч-ыц-а, па-сів-е-л-ы – па-сів-е-ўш-ы;
В. Зямл-ёй – зямл-ёю, сястр-ой – сястр-ою;
Г. Наг-а – наз-е, рук-а –руц-э, рак-а – рац-э.

25. Якую мадэль дыстрыбуцыі рэпрэзентуюць на фаналагічным узроўні наступныя прыклады: мыў – шыў –выў – быў – рыў – ныў – жыў?

А. Дапаўняльная дыстрыбуцыя;

Б. Кантрастная дыстрыбуцыя.

26. Назавіце непасрэдна састаўныя (метад НС) у наступным сказе: Прыветнае сонца пяшчотна праводзіць мяцёлачкаю праменняў па твары зямлі.

А. Прыветнае, сонца, пяшчотна, праводзіць, мяцёлачкаю, праменняў, па, твары, зямлі.

Б. Прыветнае сонца, пяшчотна праводзіць, мяцёлачкаю праменняў, па твары зямлі.

27. З дапамогай аналізу па НС укажыце дэрывацыйныя ступені для слова неадпаведнасць.

А. Неадпаведнасць ← не адпавядаць;

Б. Неадпаведнасць ← адпаведны

В. Неадпаведнасць ← неадпаведны ← адпаведны ← адпавядаць.

28. Хто першым з тэарэтыкаў дэскрыптывізму прапанаваў выкарыстоўваць у мовазнаўстве трансфармацыйны метад?

А. Л. Блумфілд;

Б. Дж. Трэйгер;

В. З. Харыс;

Г. Ч. Фрыз.

29. Назавіце асноўныя рысы ядзернага сказа.

А. Паводле структуры – просты сказ;

Б. Па наяўнасці / адсутнасці даданых членаў – неразвіты сказ;

В. Паводле адносін выказвання да рэчаіснасці – сцвярджальны сказ;

Г. Выказнік – дзеяслоў у форме незалежнага стану.

30. Што ўяўляе сабой трансфармацыя ядзернага сказа?

А. Фармальныя аперацыі перабудовы ядзернага сказа;
Б. Тое ж, што і сегментацыя.

31. Што такое трансформ?

А. Сказ (словазлучэнне), які паслужыў базай для трансфармацыі;
Б. Сказ (словазлучэнне), атрыманы ў выніку трансфармацыі ядзернага сказа (словазлучэння).

32. Хто з'яўляецца аўтарам вядомай працы "Сінтаксічныя структуры"?

А. Э. Сепір;
Б. Б. Уорф;
В. Н. Хомскі;
Г. Ф Боас.

Літаратура

.


1. Академик В.В. Виноградов // Вопросы языкознания. – М., 1970. – № 1.
2. Античные теории языка и стиля – М.– Л., 1936.
3. Арно А., Лансло К. Грамматика общая и рациональная – М., 1990.
4. Ахманова О.С. Словарь лингвистических терминов. – М., 1969.
5. Березин Ф.М. История лингвистических учений.– М., 1975.
6. Березин Ф.М., Головин Б.Н. Общее языкознание. – М., 1979
7. Будагов Р.А. Человек и его язык. – М., 1974.
8. Булахов В.Г. Восточнославянские языковеды. Т. I.– Мн., 1976.
9. Булахов В.Г. Восточнославянские языковеды. Т. II,– Мн., 1977.
10. Булахов В.Г. Восточнославянские языковеды. Т. III,– Мн., 1978.
11. Виноградов В.В. Избранные труды: Исследования по русской грамматике. – М., 1975.
12. Виноградов В.В. История русских лингвистических учений.– М., 1978.
13. Гумбольдт В. Избранные труды по языкознанию. – М., 1984.
14. Донских О.А. К истокам языка. – Новосибирск, 1988.
15. Звегинцев В.А. История языкознания в очерках и извлечениях, ч. I, ч. II – М., 1965.
16. Леонтьев А.А. Язык, речь, речевая деятельность.– М., 1969
17. Лингвистический энциклопедический словарь. – М., 1990.
18. Ломтев Т.П. Общее и русское языкознание.– М., 1976.
19. Никитин М.В. Основы лингвистической теории значения.– М., 1988.
20. Общее языкознание. Формы существования, функции, история языка.– М., 1970
21. Общее языкознание: Хрестоматия / Сост. Б.И. Косовский и Н.А.Павленко. – Мн., 1987.
22. Основные направления структурализма.– М., 1964.
23. Панов Е.Н. Знаки. Символы. Языки.– М., 1983.
24. Панфилов В.З. Взаимоотношение языка и мышления.– М., 1971.
25. Пауль Г. Принципы истории языка. – М., 1960.
26. Плотнiков Б. Общее языкознание. Семинарий. – Мн., 2001

27. Плотнікаў Б. Агульнае мовазнаўства. – Мн., 1995.
28. Потебня А.А. Из записок по русской грамматике. – М., 1958.
29. Пражский лингвистический кружок. – М., 1967.
30. Рагаўцоў В.І. Практыкум па гісторыі агульнага мовазнаўства. – Мн., 2001.
31. Ревзин И.И. Современная структурная лингвистика. – М., 1977.
32. Серебренников Б.А. Причины устойчивости агглютинативного строя и вопрос о морфологическом типе языков // Морфологическая типология и проблема классификации языков. – М. – Л., 1965.
33. Солнцев В.М. Язык как системно-структурное образование.– М., 1971
34. Степанов Ю.С. Методы и принципы современной лингвистики.– М., 1975.
35. Трубецкой Н.С. Избранные труды по филологии. – М., 1987.
36. Успенский Б.А. Структурная типология языков. – М., 1965.
37. Шакун Л.М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.– Мн., 19
38. Щерба Л.В. Языковая система и речевая деятельность. – Л.,1974.
39. Якобсон Р.О. Избранные работы. – М., 1985.

## Адказы на пытанні тэстаў

## Тэст №1

| | |
|---|---|
| 1 – Д. | 23 – А-III, Б-IV, В-II, Г-I. |
| 2 – А, В, Г. | 24 – А (V ст. да н.э.– III ст. да н.э.), В (III ст. да н.э.- IV ст. н.э.). |
| 3 – А, В, Г, Ж, З, М. | 25 – В. |
| 4– В. | 26 – А. |
| 5 – Б. | 27 – Б. |
| 6 – А-IV, Б-VIII, В-VII, Г-VI, Д-II, Ж-I, З-III, К-V. | 28 – А,В. |
| 7 – Б . | 29 – А-III, Б-II, В-II, Г-I. |
| 8 – В. | 30 – А, Б, В, Г. |
| 9 – А. | 31 – А. |
| 10 – А, В, Г. | 32 – В. |
| 11 – А. | 33 – Б, В, Г. |
| 12 – В. | 34 –Б, Г, Ж. |
| 13 – Б. | 35 – В. |
| 14 – А. | 36 – Б. |
| 15 – А. | 38 –Б, Г, Д, Ж, К. |
| 16 – В. | 39 – А – II, Б – I , В – III . |
| 17 – В. | 40 – Г. |
| 18 – Б . | 41 – В. |
| 19 – В. | |
| 20 – Б. | |
| 22 – Г. | |

*** Заўвага!**

Пры адказе на пытанне №9 нельга варыянт Б разглядаць як правільны, паколькі дынаміка ўласціва моўным з’явам і на пэўным (адным) храналагічным зрэзе.

Катэгорыя склону, на думку Арыстоцеля, аб’ядноўвае ўскосныя склоны не толькі імені, але і дзеяслова (пытанне№ 31).

**Тэст №2**

| | |
|---|---|
| 1 – Г. | 17 – А-IV, Б-II |
| 2 – Г. | 18 – А, Г, Д. |
| 3 – Б. | 19 – Г. |
| 4 – Г. | 20 – А-IV , Б-I . |
| 5 – Б. | 21 – Б. |
| 6 – А-I, Б-II. | 22 – Б, Д. |
| 7 – А-III, Б-I, В-IV. | 23 – В. |
| 8 – В. | 24 – В. |
| 9 – Б. | 25 – А. |
| 10 – Б. | 26 – Б. |
| 11 – Б, Г. | 27 –В. |
| 12 – Б. | 28 – А. |
| 13 – Б. | 29 – А. |
| 14 – А, Б. | 30 – Б, В, Г. |
| 15 – Б. | 31 – А – II, VII; Б – I, III, IV, V, VI, VIII. |
| 16 – Г. | 32 – Б. |
| | 33 – В, Г, Д. |

**Тэст № 3**

| | |
|---|---|
| 1 –В. | 16 – Б, В, Г. |
| 2 –А. | 17 – А. |
| 3 – Б, Г, Д, Ж. | 18 – Б. |
| 4 – В, Г, Д. | 19 – Б. |
| 5 – .Б | 20 – Б. |
| 6 –Б, Г. | 21 – Б, В. |
| 7 – Г. | 22 – Б. |
| 8 –В. | 23 – В. |
| 9 – Б. | 24 – А. |
| 10 – А, В, Г. | 25 – Б. |
| 11 – А. | 26 – Б, В. |
| 12 – В. | 27 – А, Б, В. |
| 13 – Б, Г, Д, Ж. | 28 – Б. |
| 14 – В, Г. | 29 –А, Б. |
| 15 – В. | 30 – А – I, Б – III,В – II, Г – I, Д – IV, Ж – IV. |

## Тэст № 4

| | |
|---|---|
| 1 – Б. | 16 – А. |
| 2 – Б. | 17 – В. |
| 3 – В, Г. | 18 – А. |
| 4 – Б. | 19 – Б. |
| 5 – В. | 20 – А, В. |
| 6 – В. | 21 – Б. |
| 7 – А –I, Б – II, В – III. | 22 – Б. |
| 8 – А. | 23 – А, В. |
| 9 – Б. | 24 – Б, В, Г. |
| 10 – В. | 25 – А – III, Б – I, В – II. |
| 11 – А. | 26 – Б, В. |
| 12 – А. | 27 – А. |
| 13 – А. | 28 – Б. |
| 14 – Б. | 29 – Б, В. |
| 15 – Б. | 30 – А, Б, В, Д. |

## Тэст № 5

| | |
|---|---|
| 1 – Б. | 15 – В. |
| 2 – В. | 16 – А. |
| 3 – Б, Г. | 17 – А, Б, В. |
| 4 – А, В, Г. | 18 – В. |
| 5 – А, В. | 19 – А. |
| 6 – Б. | 20 – Б. |
| 7 – В, Г. | 21 – Г. |
| 8 – Б. | 22 – А. |
| 9 – А. | 23 – Б. |
| 10 – В. | 24 – Б. |
| 11 – А. | 25 – Б. |
| 12 –В. | 26 – А. |
| 13 – Б. | 27 – В. |
| 14 – А, Б, В. | 28 –Б,В. |

**Тэст № 6**

| | |
|---|---|
| 1 – Б. | 17 – Б. |
| 2 – В. | 18 – А. |
| 3 – Г. | 19 – Г, затым А. |
| 4 – Г. | 20 – А. |
| 5 – А. | 21 – Б. |
| 6 – Б, Г. | 22 – А. |
| 7 – В. | 23 – Б, В. |
| 8 – А, Б. | 24 – А, Б, В. |
| 9 – Г. | 25 – Б. |
| 10 – В. | 26 – Б, В, Г, Д. |
| 11 – Б. | 27 – В. |
| 12 – А, В. | 28 – В. |
| 13 – Б. | 29 – А. |
| 14 – А,В. | 30 – Б. |
| 15 – Б, В, Г, Д. | 31 – Б |
| 16 – А. | |

**Тэст № 7**

| | |
|---|---|
| 1 – А. | 16 – А. |
| 2 – Б. | 17 – А, В, Д, З, К. |
| 3 – В. | 18 – Б, Г, Д, Ж. |
| 4 – Б. | 19 – Б. |
| 5 – А. | 20 – А. |
| 6 – Б. | 21 – А – II, Б – III, В – I. |
| 7 – Б, Г, Д. | 22 – А – II, Б – I, В – III. |
| 8 – А. | 23 – А, В. |
| 9 – Б. | 24 – Б. |
| 10 – Б, В, Г. | 25 – Г. |
| 11 – А. | 26 – А. |
| 12 – А – IV, Б – III, В – II, Г – I. | 27 – А. |
| 13 – Б. | 28 – А, В |
| 14 – Б, В, Г, Д. | 29 – А. |
| 15 – Б. | 30 – Б |

**Тэст № 8**

| | |
|---|---|
| 1 – Б. | 17 – А. |
| 2 – А. | 18 – А. |
| 3 –А. | 19 –Б. |
| 4 – А. | 20 – А, Б. |
| 5 – Б. | 21 – А. |
| 6 – А, Б. | 22 – Б, В, Г. |
| 7 – Б. | 23 – А. |
| 8 – А. | 24 – Б,В. |
| 9 – Б, В. | 25 – Б. |
| 10 – В. | 26 – Б. |
| 11 – А – II, Б – III, В – II, Г –I , Д –III , Ж – I. | 27 – В. |
| 13 – Б. | 28 – В. |
| 14 – А. | 29 – А, Б, В, Г. |
| 15 – Б. | 30 – А. |
| 16 – А. | 31 – Б. |
| | 32 – В. |

**ВУЧЭБНАЕ ВЫДАННЕ**

**АНІСЬКОВА Святлана Міхайлаўна**

# ТЭСТЫ

**ПРАКТЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК
ПА ГІСТОРЫІ МОВАЗНАЎСТВА
ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА**

Падпісана да друку 01.12.03 (66). Фармат 60х84 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны. Гарнітура Таймс Ум.-др.аркушаў 3,0. Ул.-выд.аркушаў 4,1. Тыраж 30 экз.

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя
Францыска Скарыны”
246019, г. Гомель, вул Савецкая, 104
Надрукавана на ратапрынце Установы адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя
Францыска Скарыны”
246019, г. Гомель, вул Савецкая, 104